# СУРАЖСКАЯ ПАРТЫЗАНСКАЯ ЗОНА

**Дата існавання** студзень-сакавік 1942 – снежань 1943 гг.

**Месца:** Беларуская ССР, Віцебская вобласць, Суражскі раён, Віцебскі раён, Лёзненскі раён, Гарадоцкі раён, Мехаўскі раён

**Цэнтр:** вёска Пудаць, Суражскі раён

**Партызанскія фарміраванні:**
1-я Беларуская брыгада,
1-я Віцебская брыгада,
2-я Беларуская брыгада імя П. К. Панмарэнкі,
брыгада «Імя А. Ф. Данукалава»,
брыгада «Імя М. І. Кутузава» Віцебскай вобласці,
брыгада «Імя Чырвонасцяжнага Ленінскага камсамола» і інш.

**Суражская партызанская зона** (студзень-сакавік 1942 – снежань 1943) – вызваленая ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў тыле нямецка-фашысцкіх захопнікаў тэрыторыя на паўночным усходзе Віцебскай вобласці, якая ўтварылася ў выніку скаардынаваных баявых дзеянняў партызанскіх фарміраванняў на тэрыторыі Суражскага раёна, часткі Віцебскага, Мехаўскага, Гарадоцкага і Лёзненскага раёнаў Віцебскай вобласці.

У студзене-сакавіке 1942 г. у ходзе наступальных дзеянняў партызанскіх атрадаў пад кіраўніцтвам М. П. Шмырова, Д. Ф. Райцава, А. П. Дзіка, М. Ф. Біруліна, М. І. Дзячкова былі вызвалены 15 сельскіх саветаў паўночна-ўсходніх раёнаў Віцебскай вобласці. Партызаны разграмілі ў дзесятках вёсак мясцовыя акупацыйныя органы, вызвалілі ўсходнюю частку Мехаўскага і Гарадоцкага раёнаў, паўночна-ўсходнюю частку Віцебскага і паўночную Суражскага раёнаў. Такім чынам склалася Суражская партызанская зона. Цэнтрам вызваленай партызанскай зоны стала вёска Пудаць, для аховы якой быў сфарміраваны атрад з 60 чалавек пад камандаваннем Шпакава.

Вялікі ўплыў на развіццё партызанскага руху зрабіў разгром нямецка-фашысцкіх захопнікаў пад Масквой. У выніку контрнаступлення Чырвонай Арміі ўтварыўся 40-кіламетровы разрыў паміж групамі нямецкіх армій «Поўнач» і «Цэнтр», які праіснаваў з лютага па верасень 1942 г. і атрымаў назву «Суражскія вароты» («Віцебскія вароты»). Гэты разрыў сыграў вялікую ролю ў развіцці партызанскага руху. Праз яго ў тыл ворага накіроўваліся арганізатарскія і дыверсійныя групы, зброя, боепрыпасы, медыкаменты, літаратура, а з акупіраванай тэрыторыі партызаны выводзілі мірнае насельніцтва. Праз «вароты» партызаны Суражскай партызанскай зоны перапраўлялі абозы з харчаваннем для Чырвонай Арміі.

У красавіку 1942 г. атрады Суражскага раёна, якімі камандавалі М. П. Шмыроў, Д. Ф. Райцаў, А. П. Дзік, М. Ф. Бірулін, аб'ядналіся ў новае фарміраванне – 1-ю Беларускую партызанскую брыгаду. Камандзірам брыгады быў назначаны М. П. Шмыроў. 1-я Беларуская брыгада абараняла «Суражскія вароты».

Да лета 1942 г. межы зоны значна пашырыліся, ахапілі вялікую тэрыторыю ў чатырохвугольніку Сураж – Віцебск – Гарадок – Усвяты. У яе ўваходзілі Суражскі раён, частка Механўскага, Гарадоцкага, Віцебскага і Лёзненскага раёнаў агульнай плошчай 3 тыс. км$^2$. Зону абаранялі партызанскія брыгады 1-я Беларуская, імя А. Ф. Данукалава, 2-я Беларуская імя П. К. Панмарэнкі, імя М. І. Кутузава Віцебскай вобласці, імя Чырвонасцяжнага Ленінскага камсамола, 1-я Віцебская і інш. Агульнае кіраўніцтва ўсёй баявой і гаспадарчай дзейнасцю ў зоне ажыццяўлялі Суражскі падпольны РК КП(б)Б і спецыяльны штаб на чале з сакратаром райкама І. Ф. Бардзіянам, а таксама Гарадоцкі, Віцебскі, Мехаўскі, Лёзненскі падпольныя райкамы КП(б)Б, адноўленыя мясцовыя органы савецкай улады пад агульным кіраўніцтвам Віцебскага падпольнага абкама КП(б)Б, Паўночна-Заходняй аператыўнай групы ЦК КП(б)Б, камандавання Калінінскага (да 20.10.1943) і 1-га Прыбалтыйскага франтоў.

На вызваленай партызанамі тэрыторыі быў ліквідаваны акупацыйны рэжым. У в. Пудаць Суражскага раёна працавалі лесапілка, маслазавод, мельніца, гарбарная, абутковая, швейная, кола-абозная арцелі, пошта, баня, пякарня. На кардоннай фабрыцы былі створаны майстэрні па рамонту зброі і вырабу лыж, працаваў камбінат бытавога абслугоўвання (майстэня па пашыву адзежы, абутку, цырульня, сталовая). На базе мясцовай участковай бальніцы быў створаны госпіталь. У партызанскай зоне праводзілася актыўная мабілізацыя насельніцтва ў Чырвоную Армію.

У канцы верасня 1942 г. гітлераўцы, падцягнуўшы свежыя сілы, ліквідавалі «Суражскія вароты». Нягледзячы на гэта, Суражская партызанская зона працягвала існаваць да снежня 1943 г., але яе тэрыторыя некалькі звузілася.

Зона знаходзілася пад пастаянным баявым ўздзеяннем 59-га нямецкага армейскага корпуса. Апрача яго карныя аперацыі супраць партызан і мясцовага насельніцтва зоны вялі камендатура Смаленска, 201-я ахоўная дывізія, 205-я пяхотная дывізія, 19-ы паліцэйскі полк СС і інш. Перыядычна да карных аперацый прыцягваліся часці 3-й танкавай арміі. З чэрвеня 1942 да чэрвеня 1943 гг. гітлераўцы правялі супраць партызан зоны 11 карных аперацый. У выніку жорсткіх баёў партызаны вымушаны былі на час пакінуць зону і выйсці ў суседнія раёны Віцебскай вобласці, а часткай сіл – за лінію фронту.

У снежні 1943 г. значная частка зоны вызвалена войскамі 1-га Прыбалтыйскага фронту ў выніку Гарадоцкай аперацыі 1943 г. Большасць партызанскіх фарміраванняў, якія засталіся ў зоне, злучыліся з Чырвонай Арміяй.

**ЛІТАРАТУРА**


1. **Витебские** (Суражские) ворота [Электронный ресурс] / подгот. И. Шишкова // «Победа – Витебск». – Режим доступа: http://www.pobeda.witebsk.by/land/epizode/suraj/. – Дата доступа: 22.04.2021.
2. **Головко, С.** Ворота жизни и борьбы / С. Головко // Беларуская думка. – 2014. – № 12. – С. 46–52.
3. **Партизанские** зоны // Беларусь партизанская = Guerrilla Belarus : иллюстрированная энциклопедия партизанского движения в Беларуси в годы Великой Отечественной войны / под общ. ред. А. М. Литвина ; пер. на англ.: А. В. Титова, Н. Ю. Жданова. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2019. – С. 91–101. – (Беларусь помнит: во имя жизни и мира).

4. **Пасэ, У. С.** Суражская партызанская зона / У. С. Пасэ // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : энцыклапедыя / рэдкал.: І. П. Шамякін [і інш.]. – Мінск : БелСЭ імя П. Броўкі, 1990. – С. 582.

5. **Погорелов, А. А.** У «Суражских ворот» / А. А. Погорелов ; лит. обраб. К. Папковского. – Минск : Беларусь, 1980. – 191 с.

6. **Радюк, А. В.** Суражская партизанская зона / А. В. Радюк // Віцебшчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны : зборнік навуковых артыкулаў / склад.: А. А. Крыварот [ і інш.]. – Минск : Беларуская навука, 2015. – С. 147–151.